# ПІНСК
# Кіно ў «Казіно» ды адзіная «Перамога»

Сінематограф у Пінску з'явіўся дзякуючы купецкаму сыну Давіду Лейбавічу Баярскаму. Па яго ініцыятыве і за яго грошы ў 1912 годзе на скрыжаванні вуліц Інжынернай (цяпер В. Харужай) і Падоўжна-Школьнай (цяпер У. Каржа) з'явіўся будынак кінатэатра «Казіно». Давід Баярскі выкупіў пляцоўку зямлі ў Друйскіх-Любецкіх і пабудаваў будынак у стылі эклектыкі – былі тут элементы мадэрну, неаготыкі і іншых стыляў. Першы кінатэатр у Пінску мог мець назву «Луўр». Але ў апошні момант Давід раздумаў і назваў кінатэатр «Казіно». Гэта назва захавалася аж да 1940-х гадоў, калі савецкая ўлада пераназвала яго ў кінатэатр «Радзіма».

Кінатэатр «Казіно» карыстаўся вялікім поспехам – трапіць на сеанс было непроста. Жадаючых паглядзець кіно было так шмат, што час ад часу адміністрацыя ўладкоўвала дадатковыя глядзельныя месцы. Дарэчы, кінатэатр працаваў без выхадных. Разам з мастацкімі фільмамі ў «Казіно» дэманстравалі навуковае і гістарычнае кіно. Уласнікі былі прасунутымі людзьмі, часта ездзілі за мяжу, дзе імкнуліся пераймаць новыя тэхналогіі – усталёўвалі сучасную апаратуру, круцілі самыя апошнія навінкі кінематографа.

Да 1990-х гадоў кінатэатр не змяняў свайго профілю. У сакавіку 2006 года ў будынку былога кінатэатра адбылося афіцыйнае адкрыццё Палескага драматычнага тэатра. Звонку будынак захаваў сваё гістарычнае аблічча, хоць і не цалкам, у сярэдзіне ж яно пераабсталявана для працы ў сучасных умовах.

У савецкія часы ў Пінску была шырокая сетка кінатэатраў, гораду належалі «Дружба», «Радзіма», «Перамога». А яшчэ працавалі ведамственныя кінатэатры: клуб 40-годдзя Кастрычніка (ад «Пінскдрэва»), клуб чыгуначнікаў, ДК «Трыкатажнік». Цяпер засталася толькі «Перамога». Адкрыўся кінатэатр 14 лютага 1981 года. Тады ў «Перамогу» прыходзілі кожны дзень да тысячы чалавек, месячны план быў па наведанні 25 – 30 тысяч чалавек.




*ПІНСК. Будынак кінатэатра «Казіно» ў 1912 годзе.*
*Палескі драматычны тэатр, 2006 год.*
*Сучасны кінатэатр.*